# Фокусы ў фокусе зімовых мар

## Чатыры у адным: праект з вынiковасцю

**У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" распачала сваю працу выстаўка твораў студэнтаў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў "Зімовыя мары".**



І.Дубяга. "Міракль".

У амаль бясснежныя дні сёлетняга снежня прадстаўленыя на выстаўцы работы ствараюць сапраўды зімовы настрой, нібыта наведвальнік апынуўся ў нейкай чароўнай вясковай хатцы акурат у ноч перад Раджаством.

У творах, у асноўным, выкарыстоўваюцца традыцыйныя для айчыннага ДПМ матэрыялы і тэхнікі: гліна, валенне з воўны, выцінанка, ткацтва, габелен. Але, нягледзячы на пэўную традыцыйнасць, відавочна, што аўтары жывуць у XXI стагоддзі: то тут, то там адчуваюцца сучасныя тэндэнцыі — да прыкладу, ліхтары з амаль супрэматычным узорам, увядзенне афрыканскіх арнаментаў і нетрадыцыйных колераў. І якраз у спалучэнні такіх розных элементаў і нараджаецца адчуванне адпаведнасці нашаму эклектычнаму, мітуслівому стагоддзю.

Чырвонай ніткай праз выстаўку праходзіць тэма народных паданняў і міфаў: тут жывуць балотнікі і вадзянікі, чароўныя істоты граюць на жалейцы, загаворваючы стыхіі прыроды. Бачна,



В.Канапелька. "Балотнік".

што аўтары выстаўкі сапраўды заглыбляліся ў жыццёвы лад, сімволіку як роднага краю, так і экзатычных — паўночных і паўднёвых — краін. Светапогляд шматлікіх пакаленняў беларусаў праяўляецца тут, уваходзіць у кантакт з нашым, каб распавесці вечныя ісціны пра сваю зямлю і павагу да яе.

Таксама ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" працуе яшчэ адзін выставачны праект — "3 > 1.Частка 3". Гэтым разам у ім — выстаўкі трох выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, што працуюць там на кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Праект "13" Дзяніса Барсукова прадстаўляе менавіта жывапісныя творы аўтара за апошнія сем гадоў. Атрымалася амаль па дзве работы за кожны з іх, што спрыяў станаўленню асобы мастака.

Ксенія Дзягілева-Бяляева на выстаўцы "Сустрэча" прадставіла партрэты, нацюрморты, пейзажы, тэматычныя карціны, напісаныя ў розныя гады. Работы з'яўляюцца адлюстраваннем сустрэч, якія прайшлі знешне незаўважна і ціха, але засталіся ў душы назаўсёды: гэта сустрэчы з сябрамі, а таксама са сваімі дзецьмі, якіх у Ксеніі шасцёра.

Сумесная выстаўка Людмілы Дамнянковай і Наталлі Аждзер "Дзень за днём" выклікана да жыцця незвычайнымі магчымасцямі тэхнікі валення. У галерэі экспануюцца арыгінальныя тэкстыльныя аб'екты. Фокус прадстаўленай тэмы скіраваны на тактыльную перадачу адчування цыклічнасці і замкнёнасці, пераемнасці ў свеце, што падкрэслівацца аўтарамі як антытэза сучаснаму жыццёваму рытму.

**Фёдар АЛЬХОЎСКІ**



Н.Дзяруга. "Ветрыкі".